# Чым аралі нашы продкі?

М.Ф.АПЕЙКА, бібліятэкар БАТУ

Перапрацоўка прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці заўжды займала вялікае і, трэба заўважыць, пачэснае месца ў гаспадарцы Беларусі.Найшаноўнейшым чалавекам беларускай вёскі заўсёды быў млынар, з самых старадаўніх часоў звязаны мацнейшымі повязямі з усімі вядомымі беларусу містычнымі сіламі. І нездарма, дарэчы, заснавальнікам горада Мінска быў млынар і волат-чарадзей Менеск, млын якога перамолваў не толькі збожжа, але таксама зерні Дабра і Зла, аддаючы гораду толькі Дабро, ратуючы родны горад ад сіл Зла.

Дарэчы, паколькі млын Менеска, як вядома, быў млын вадзяны, самае існаванне гэтага млына ў такой старажытнасці сведчыць аб тым, што вадзяныя млыны на Беларусі будавалі не меней, як тысячу год таму.

Па дадзеных Страбона і Вітрувія, вадзяныя млыны працавалі ў часы Мітрыдата і Юлія Цэзара, а ўвогуле мукамольныя млыны былі вядомыя яшчэ ў часы прарока Майсея, як гэта згадана ў Бібліі.

Млыны на Беларусі выкарыстоўваліся, галоўным чынам , для вырабу мукі і круп са збожжа. Хаця для іншых мэт млыны, безумоўна, гэтаксама выкарыстоўваліся, але, паколькі размову пра, напрыклад, папяровыя млыны (дарэчы, зусім іншай канструкцыі) мы тут не вядзем.

На Беларусі працавалі млыны з жывымі рухавікамі(валовыя і конныя, або, як іх яшчэ звалі, тапчакі), вадзяныя, ветраныя, паравыя.

Найбольш за ўсё было вадзяных млыноў. Напрыклад, згодна дадзеным «Военно-статистического обозрения Российской империи» за 1849 год, у Гродзенскай губерні вадзяных млыноў было 393, ветракоў - 258, а конных - 261.[1].

А толькі ў адной Магілёўскай губерні, згодна звестак А.С.Дэмбавецкага ў ягонай вядомай працы [2] апублікаванай у 1884 годзе, вадзяных млыноў працавала 670 . Цікава, што побач з гэтымі млынамі вельмі часта працавалі сукнавальнавальні, вінакурні, бровары, дзягцярныя заводы, смалакурні і г.д.

Дарэчы, перапрацоўка прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці ў рознага кшталту гатовыя для спажывання тавары была здаўна добрай традыцыяй нашай зямлі.

Што да ветракоў, то іх у Магілёўскай толькі губерні, згодна звестак А.С.Дэмбавецкага, працавала 89, валовых млыноў існавала тады 45, а паравых млыноў было 3.

Апроч мукамольных млыноў, у Магілёўскай губерні працавала 45 заводаў па вырабу круп.

Апроч крупчатных заводаў, працавалі на Беларусі таксама млыны для круп. Крупадзёрны млын сістэмы Мартэна з двума асартыментамі машын перапрацоўваў за 24 гадзіны 5 тон ячменю, з якога атрымоўвалася 1830 кг круп, 905 кг мукі, 280 кг дробязі, 390 кг крупкі, 1475 кг вотруб'я і толькі 130 кг страт.

Мукамольныя млыны аж да XVI стагоддзя займаліся толькі раздрабненнем збожжа, сартаванне змолатага прадукта або не вялося, або рабілася самімі спажыўцамі.Але потым гэтую аперацыю пачалі рабіць на млынах, якія з-за гэтага сталі складаней і набылі больш закончаны канструкцыйна выгляд.Першыя апісанні такіх млыноў належаць да XVII стагоддзя, рух ім надавалі вадзяныя або ветраныя рухавікі.

Першыя згадкі пра ветракі бачым у XI стагоддзі. Ветракі існавалі розных канструкцый.Найпросты вятрак звычайна меў адзін мукамольны пастаў.

Большай дасканаласцю адрозніваліся ветракі галандскага тыпу, у якіх паварочвалася толькі верхняя частка млына, дзе знаходзіўся вал з крыллямі. Будынкі такіх млыноў рабіліся з цэглы або з каменя ў форме сцятага конуса.Будавалі млыны гэтаксама з дрэва ў выглядзе сцятай васьміграннай пірамі-ды.Іншым разам ніжняя частка будовы была каменная, а верхняя - драўляная.

А ў пачатку XX стагоддзя, як пісаў аб гэтым Кляўдуш Дуж-Душэўскі[3], «усіх млыноў (ветракоў, вадзяных і паравых) перад вайной было на Беларусі 9-11 тыс.

Яны перамолвалі збожжа на суму не менш як 15 млн. руб.»

Такім чынам, перапрацоўка збожжа на муку і

крупы павялічвалася з кожным годам.

Але не толькі на муку і крупы перапрацоўвалі збожжа беларусы.Тут працавала шмат бровараў, вінакурных і шпіртагонных заводаў, прычым цікава, што ў пачатку XX стагоддзя ,як адзначае К.Дуж-Душэўскі, «у 1910-1911 гг. Беларусь выгнала 40% водкі больш 17,3млн. вёдзер(Царства Польскае пры 499 заводах - 15,8 млн. вёдзер) - гэты лік складаў каля 13% выгнанай водкі ўсёй Расейскай імперыі (вядро=20 гарэлачным бутэлькам=12,299л)». Той самы аўтар налічвае ў 1911 годзе 85 бровараў на Беларусі, каля 40 крухмальных і патачных заводаў.

Па словах К.Дуж-Душэўскага, «ворнай зямлі пры заводах было каля 440 тыс. дзесяцінаў , з якіх 55 тыс. дзесяцінаў засаджаныя бульбай.У 1911 годзе Беларусь пераганяла на шпірт 2622 тыс. пудоў збожжа, у тым ліку 284 тыс. пудоў жыта, 200 тыс. пудоў кукурузы. Акрамя таго, бульбы 40480 тыс. пудоў і патакі 22,7 тыс. пудоў.»

(1 дзесяціна=1,09 га; 1 пуд=16,38 кг).

Гарэлкай, шпіртам і віном Беларусь гандлявала, галоўным чынам, з губернямі Еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, дзе быў для гэтых тавараў досыць добры рынак. Прычым цікава, што амаль увесь гэты тавар знаходзіў пакупнікоў па-за межамі Беларусі.

85 бровараў у 1910 годзе наварылі піва 7,6 млн. вёдраў (93 472 400 л.).

Апроч таго, на Беларусі было, па дадзеных К.Дуж-Душэўскага, «каля 8-10 фабрык цукерак і шакаладу, некалькі воцатавых заводаў, фруктова-кансервавых, шмат заводаў сэльтэрскай вады і наагул лёгкіх напояў, саладовыя, мёдаварныя, па стэрылізацыі малака. Было шмат булачных,хлебных і кандытарскіх пякарняў, каўбасных - з экспартам у Петраград і Маскву, дзе беларускія прадукты насілі назву "літоўскіх"».

Звяртаем асаблівую ўвагу чытачоў на існаванне заводаў па стэрылізацыі малака.

Сама наяўнасць такіх прадпрыемстваў ужо сведчыць аб высокім узроўні культуры нашых продкаў.

Маслабойні, сыраварні былі вельмі распаўсюджанымі прадпрыемствамі, з бегам часу іншыя з іх пераўтвараліся ў маслабойныя заводы.

На Беларусі, як вядома, традыцыі кулінарнага мастацтва вельмі багатыя і разнастайныя, што непасрэдна жывіла і надзвычай добра ўплывала і на развіццё галін прамысловасці па перапрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў для харчавання.

Табачных прадпрыемстваў разам з фабрыкамі тытунёвых вырабаў было на Беларусі, згодна К.Дуж-Душэўскаму, у 1910 годзе да 82 з коштам вытворчасці 13 з лішкам млн. рублёў.Прычым цікава, што Гарадзеншчына вырабляла тытунёвай прадукцыі на 10 з лішкам млн. рублёў.Найбольшая фабрыка тытуню - Шарашэўскага ў Гародні - мела абарот да 5 млн. рублёў. Значныя фабрыкі тытуню былі яшч ў Пінску, .Віцебску, іншых беларускіх гарадах.

Складаныя машыны для перапрацоўкі сельс кагаспадарчых прадуктаў патрабавалі сур'ёзнейша адукацыі, вед у галінах матэматыкі, фізікі,найпер механікі, хіміі...

Калі падлічыць, колькі люду працавала толь на згаданых вышэй прадпрыемствах (а гэта дадзе ныя толькі па прадпрыемствах харчовай галіны, ды тое не поўныя), то міжволі ўзнікае пытанне: ці шма каму на тагачаснай Беларусі магчыма было быц непісьменнымі і неадукаванымі? І сапраўды, ка мець магчымасць працаваць у сыраварнях нават аб маслабойнях, беларусы канца XIX - пачатку XX ста годдзя мусілі канчаць спецыяльныя курсы па сыра варэнню або па масларобству, якія існавалі ў шэра гу беларускіх гарадоў дбаннем спярша мясцовы Таварыстваў сельскіх гаспадароў, а потым - і зем стваў.

Мы бачым, што перапрацоўка сельскагаспа дарчых прадуктаў для харчавання ў той час набыл рысы прамысловасці. І сапраўды, чаму гэта не ска рыстацца спрыяльным геаграфічным становішчам для ажыўленага гандлю? Навошта гандляваць сы равінай, калі ёсць добрыя магчымасці вырабляць гатовыя тавары , у дадзеным выпадку, харчовыя та вары? І нашы продкі, сапраўды, славіліся ў свеце як каўбаснікі, і як млынары, і як выдатнейшыя кул інары, і як вынаходцы, што галоўнае, розных машын і механізмаў.

А.Гваньіні тады пісаў, што, калі недзе і ёсц радзіма багіні Цэрэры(багіня зямной ўрадлівасці ў старажытным Рыме - М.А), то гэта менавіта гэта зямля, бо ўрадлівасць глебы залежыць , найперш ад працавітасці людзей і іх любові да сваёй зямлі. А, прызнаваўся Гваньіні, такой любові да зямлі, як на Беларусі, ён не бачыў нідзе, хаця шмат якія краіны яму давялося наведаць [А працаваў ён у сучаснай Гродзенскай вобласці - М.А.].

І ў XIX стагоддзі да беларусаў прыязджалі вучыцца рупліваму гаспадаранню з усіх губерняў Еўрапейскай Расіі, і нядзарма так было: сельская гаспадарка Беларусі была тады на адным узроўні з сельскагаспадарчай вытворчасцю такіх краін, як Фінляндыя і Польшча, гэта значыць, на ўзроўні Заходняй Еўропы, але пра гэта мы ўжо раней згадвалі.

1.Военно-статистическое обозрение Российской империи.Изд. по Высочайшему повелению 1-м отделением Департамента Генерального Штаба. Т.IX. Ч.3. Гродненская губерния. - СПб,1849. - С.87.

2.Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилёвской губернии.В 3 кн.Кн.3. - Могилёв на Днепре, 1884.

3. Дуж-Душэўскі К.Аб развіцці гаспадаркі Беларусі ў пачатку XX ст.// Спадчына. - 1998. - №4. - С.100-113.